Дзяржаўная ўстанова культуры
"Цэнтралізаваная бібліятэчная сетка
Асіповіцкага раёна"
*Цэнтральная раённая бібліятэка*

*Серыя «Героі Савецкага Саюза - асіпаўчане»*

# ПОМНІМ ГЕРОЯЎ ЗЯМЛІ АСІПОВІЦКАЙ



## МАЙСТРЭНКА Барыс Аляксандравіч

# МАЙСТРЭНКА
# Барыс Аляксандравіч

**(01.12.1924 –15.01.1945)**

## БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА



**Нарадзіўся Барыс Аляксандравіч Майстрэнка 1 снежня 1924 года ў г. Асіповічы ў сям'і служачых.У чатырохгадовым узросце разам з сям'ёй пераехаў спачатку ў Жлобін, а потым у Ноўгарад-Северскі.Вучыўся ў школе, пастапіў у камсамол. Калі пачалася вайна бацькі адправілі Барыса ў Маскву к родзічам.Але іх ён не застаў і быў эвакуіраваны ў Ташкент. Тут Барыс працаваў слесарам на заводзе.У жніўні 1942 года, прыбавіўшы сабе год, ён паступіў у Харкаўскае танкавае вучылішча і скончыў яго ў 1943 годзе.**

**З ліпеня 1943 года на Ленінградскім фронце. За два першыя гады франтавога жыцця лейтэнант танкіст Майстрэнка паказаў стойкасць, смеласць у многіх баявых аперацыях і быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём "За адвагу".**

**Камандзір танка лейтэнант Б.А.Майстрэнка вызначыўся ў чэрвені 1944 года ў час прарыву абароны праціўніка на Карэльскім перашыйку і**

**вызваленя г. Выбарг. У баі прыняў на сябе камандаванне ротай. Танкавая рота Б. Майстрэні знішчыла 3 доты, 8 здотаў, 15 гармат, 20 кулямётаў, 10 мінамётаў і больш за 150 гітлераўцаў.Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15 сакавіка 1945 года**

**Памёр 15 студзеня 1945 года ад ран. Яго імем названа сярэдняя школа №1 у Ноўгарадзе-Северскім Чарнігаўскай вобласці, дзе ён вучыўся. Помнік Герою ёсць таксама на “Алеі герояў” у г.Асіповічы Магілёўскай вобласці.**

## ГІСТОРЫЯ ПОДЗВІГУ

**10 чэрвеня 1944 войскі Чырвонай Арміі на Карэльскім перашыйку перайшлі ў наступленне.Танкавая брыгада, у якой служыў Барыс Майстрэнка атрымала баявую задачу прарваць тры абарончыя паласы праціўніка, вызваліць Выбарг і выйсці да Фінскага заліву. Вораг пабудаваў на гэтым участку моцную абарону.**

**Машына Барыса Майстрэнкі ішла наперадзе групы танкаў, якія ламалі варожыя ўмацаванні. Гітлераўцы люта супраціўляліся, ужываючы супраць нашых танкаў ўсе віды зброі. Але машына Майстрэнкі была, нібы крэпасць, - не падарваць мінай, не прабіць снарадам. Экіпаж Майстрэнкі выйшаў к перакрыжаванню дарог недалёка ад вёскі Коўкарвайкуля.Замаскіраваўшы танк, камандзір даждаўся падыходу асноўных сіл і нечаканым**

ударам па ворагу падтрымаў наступленне танкістаў.

Затым лейтэнант Майстрэнка здзейсніў подзвіг, пра які загаварылі далёка за межамі часці. Фарсіраваўшы рэчку Сума-Йокі, ён адзін прарваўся ў тыл ворага, устанавіў свой танк на выгоднай пазіцыі і дванаццаць гадзін запар стрымліваў напор праціўніка, расстрэльваючы яго сілы з гарматы і кулямёта. Вораг некалькі разоў спрабаваў захапіць савецкі танк і ўзяць у палон экіпаж, але беспаспяхова.Калі нашы войскі наблізіліся да месца бою танка Майстрэнкіса шматлікім ворагам, байцы ўбачылі вакол яго машыны дзясяткі трупаў гітлераўцаў і разбітыя машыны з ваеннымі грузамі. З гэтага няроўнага бою экіпаж Барыса Майстрэнкі выйшаў цэлым.

У адным з баёў у час прарыву трэцяй лініі абароны пад Выбаргам загінуў камандзір танкавай роты. Патрэбна было давесці бой да перамогі. І Барыс Аляксандравіч Майстрэнка бярэ камандаванне танкавай ротай на сябе.Бой закіпеў з новай сілай. Адна за другой падаўлены агнявыя точкі ворага. У гэтым баі Барыс знішчыў чатыры супрацьтанкавыя гарматы ворага, тры кулямёты, пяць мінамётаў, раздушыў гусеніцамі сваёй грознай машыны тры дзоты і знішчыў да паўсотні гітлераўцаў.Танкісты выканалі сваю задачу. За гэты подзвіг Барыс Майстрэнка быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза.

# ЛІТАРАТУРА

1. Майстренко Борис Александрович – Герой Советского Союза, род. в г.Осиповичи // Навечно в сердце народном. – Минск, 1984. – С. 320-321.

2.Майстренко Б. А. // Герои Советского Союза : краткий биограф. словарь. В 2 т. Т. 2. – Минск,1987. – С. 12.

3.Майстренко Борис Александрович [Текст] : биографические сведения // Гордость и слава Могилёвщины. – Могилёв, 2005. Т. 1: Герои Советского Союза. – С. 144.

4.Майстренко Борис Александрович : [Герой Сов.Союза, урож. г. Осиповичи] // Республика Беларусь : энцикл. В 6 т. / ред. Г. П. Пашков. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 615.

5.Майстренко Б. А. // Их именами названы… – Минск,1987. – С. 386.

6.Майстренко Борис Александрович : [Герой Сов.Союза, урож. г. Осиповичи] // Республика Беларусь : энцикл. В 6 т. / ред. Г. П. Пашков. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 615.

7.Майстренко Борис Александрович [Электронный ресурс] // Герои страны : интернет проект. – Минск, 2000-2013. – Режим доступа: http://www.warheroes.ru

8.Майстренко Борис Александрович [Электронный ресурс] // Электронный банк документов «Подвиг народа в Великой Отечественной войне 1941-1945 гг. – Режим доступа: http://www.podvignaroda.mil.ru

9.Радзіма Майстрэнкі Б. А. // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўс. вобл. – Мінск, 1986. – С. 82-83.

10.Скульбедов, В. Мастер – ас танка : [о Герое Сов. Союза Б. А. Майстренко, урож. Осиповичи] // Зямля і людзі. – 2005. – 26 студз. – С.5.

